Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 133 (27991) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Уладары паветра**

СТАР. 4

Сямейная газета



**Гісторыя пераадолення і кахання**



**Авантурны маршрут**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Мясцовая ўлада павінна ісці насустрач людзям. Прадстаўнікі райвыканкамаў і сельскіх выканкамаў іншы раз баяцца прымаць сур'ёзныя рашэнні пры разглядзе зваротаў грамадзян, імкнучыся засцерагчы сябе. Аднак гэта няправільны шлях. Неабходна быць больш смелымі ў прыняцці канкрэтных рашэнняў і імкнуцца ўглыбіцца ва ўсе праблемы, з якімі ідуць да іх людзі».*

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 16.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15 349,00 | ▲ |
| Еўра | 16 905,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,53 | ▲ |
| Укр. грыўня | 697,68 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АХ, ЯКІЯ БЫЛІ СТРОІ!



Фота БЕЛТА.

**У гомельскім філіяле Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава прадстаўлены новы выставачны праект «Чалавек-Строй-Абрад». Акцэнт выставы жаночых касцюмаў зроблены і на знешняй прыгажосці традыцыйнага жаночага адзення, і на абрадавай сімволіцы кожнага яго элемента і арнаменту, якія старанна ткаліся альбо вышываліся на кашулях. У святочны дзень жанчына апранала свае найлепшыя строі, каб пакрасавацца не толькі перад людзьмі, але і перад Богам. Навуковы супрацоўнік музея Сяргей Чавус з задавальненнем расказвае пра гэта наведвальнікам выставы.**

■ Па сезоне

## КУРОРТЫ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

**Ад падарожжа ў якія краіны гэтым летам лепш адмовіцца і колькі грошай фірма павінна вярнуць за нерэалізаваны тур?**

**Устрымацца ад паездак у небяспечны сёння Туніс Міністэрства спорту і турызму рэкамендавала яшчэ два тыдні таму. «Тэракты бываюць розныя, напрыклад, па палітычных матывах, калі людзі, якія прыехалі на адпачынак, гінуць выпадкова. Але ў Тунісе «паляванне» вялося менавіта на турыстаў, сітуацыя неардынарная. Таму мы не сталі чакаць рэакцыі Міністэрства замежных спраў і ўлады Туніса і апублікавалі рэкамендацыю не наведваць краіну. Толькі потым, праз 2-3 дні, сама афрыканская дзяржава абвясціла надзвычайнае становішча», — тлумачыць рашэнне дырэктар Дэпартамента па турызме Мінспорту Вадзім КАРМАЗІН.**

СТАР. 3



■ Як нас дураць

## БЯЛІЗНА І ПОСУД ЯК ПРЫКРЫЦЦЁ

### Як пенсіянеры становяцца ахвярамі ашуканцаў

**Пра тое, што нельга адчыняць дзверы незнаёмцам, усе мы чулі з дзяцінства. І калі малеча яшчэ, баючыся ці то дарослых дзядзькаў з вуліцы, ці то бацькоў, ад якіх за непаслухмянасць і «ўляцець» можа, з крыкам «А мамы дома няма!» трымаюць абарону, то старыя часам забываюцца на правілы бяспекі. Так, днямі на хітрыкі махляроў «павялася» 84-гадовая жыхарка Першамайскага раёна сталіцы.**

Пенсіянерка была дома адна, калі ў дзверы пазванілі. Маладая жанчына, што хадзіла па пад'ездзе, прапаноўвала купіць камплект пасцельнай бялізны. Збыць тавар не атрымалася, але затое махлярка ўпэўнілася, што, акрамя бабулі, у кватэры больш нікога няма. Даведалася і пра магчымае месца захоўвання каштоўнасцей. Інфармацыю жанчына перадала дзвюм «сяброўкам», што чакалі на лесвіцы. Праз некалькі хвілін у кватэру пенсіянеркі зноў пазванілі. Саўдзельніцы гандляркі бялізнай прадставіліся супрацоўнікамі арганізацыі па абслугоўванні газавага абсталявання. Пакуль адна, каб адцягнуць увагу старой, рабіла выгляд, што правярае газавую пліту, другая шукала схованку з грашыма. І знайшла: з хрустальнай вазы ў шафе прапалі восем мільёнаў.

СТАР. 3